# *ФИЛОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ*

## ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ

# *PHILOLOGY*

## LITERARY STUDIES

УДК 821.161.3

**В. А. Буднік**
Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт»,
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вул. Маскоўская, 267, 224000 Брэст, Рэспубліка Беларусь,
+375 (29) 727 87 00, budnik84@bk.ru

## ТЫПАЛОГІЯ ГЕРОЯЎ І КАМПАЗІЦЫЙНА-АПАВЯДАЛЬНЫЯ АДМЕТНАСЦІ АПОВЕСЦІ І. ПТАШНІКАВА «ТАРТАК»

Артыкул прысвечаны актуальнай у сучасным літаратуразнаўстве праблеме асэнсавання трагедыі беларускіх «хатыняў». Даследуецца выяўленне кампазіцыйна-апавядальнай адметнасці аповесці І. Пташнікава «Тартак», тыпалогія герояў твора. Неабходнасць вывучэння названага пытання выклікана імкненнем паказаць, як І. Пташнікаў здолеў раскрыць супраціўленне беларускага народа акупантам і трагічным абставінам вайны праз асабістыя лёсы герояў. У артыкуле аналізуецца персанажная сістэма і тыпалогія герояў твора, выяўляюцца функцыі ўнутраных маналогаў, рэтраспектыўных эпізодаў, апісанняў паводзін, знешняга аблічча герояў для раскрыцця іх характараў. Аналізуецца кампазіцыйна-наратыўная адметнасць твора: праз унутраныя маналогі і ўспаміны герояў пісьменнік падрабязна прасочвае жыццёвыя лёсы кожнага з сямі герояў. Акцэнтуецца ўвага на тым, што характары-тыпы разгледжанага твора з'яўляюцца важнымі па сваёй мастацкай канцэптуальнасці, але рознымі па духоўнай і маральна-этычнай сутнасці. Характарызуецца спецыфіка творчай манеры І. Пташнікава. На аснове атрыманых назіранняў зроблены вывад, што прыём рэтраспекцыі, які ўдала выкарыстоўвае пісьменнік, дапамагае яму сцвердзіць ідэю непаўторнасці лёсу і жыцця кожнага чалавека. Дакладна паказваецца, што ў творы раскрываецца канцэпцыя гераічнага, праяўленне якога пісьменнік бачыць у надзвычайнай жыццёвай трываласці і маральнасці, якія дапамагаюць героям пераадолець трагічныя ваенныя выпрабаванні.

**Ключавыя словы:** характары-тыпы; сістэма герояў; наратыўныя стратэгіі; сюжэтна-кампазіцыйная спецыфіка; трагізм; апавядальная манера; канцэпцыя гераічнага; псіхалагізм.
Бібліягр.: 2 назвы.

**V. A. Budnik**
Educational Institution "Brest State Technical University", Ministry of Education of the Republic of Belarus,
267 Moskovskaya str., 224000 Brest, the Republic of Belarus, +375 (29) 727 87 00, budnik84@bk.ru

## THE TYPOLOGY OF THE HERO AND THE COMPOSITE-STORY NARRATIVE PROPERTIES I. PTASHNIKOV "TARTAK"

The article is devoted to the problem of understanding the tragedies of the Belarusian Khatyn in the current literary criticism. Detection of compositional and narrative features of the novel by I. Ptashnikov "Tartak", as well as the typology of the heroes of the work are investigated. The need to study this issue is caused by the desire to show how I. Ptashnikov managed to uncover the resistance of the Belarusian people to the invaders and the tragic circumstances of the war through the personal fate of the heroes. The article analyzes the character system and typology of the heroes of the work, reveals the functions of internal monologues, retrospective episodes, descriptions of behavior, the appearance of the characters to identify their characters. The compositional and narrative feature of the work is analyzed: through

© Буднік В. А., 2020

internal monologues and memoirs of heroes, the writer traces in detail the life destinies of each of the seven heroes. Attention is focused on the fact that the character types of the work considered are important in their artistic conceptualism, but different in spiritual and moral ethical essence. The specificity of the creative manner of I. Ptashnikov is reasonably characterized: the human characters in the work are presented in a short, monosyllabic, but with due artistic depth and accuracy. Based on the observations made, it was concluded that the retrospection technique, which the writer successfully uses, helps him to confirm the idea of the uniqueness of the fate and life of every person. It is precisely indicated that the work reveals the concept of the heroic, the manifestation of which the writer sees in the extreme vitality and morality with which the heroes overcome the tragic military trials.

**Key words:** characters; types of characters system; narrative strategy; plot-compositional specifics; tragedy; narrative style; the concept of heroic psychology.

**Уводзіны.** Тэма Вялікай Айчыннай вайны, пасляваеннай вёскі ў творчасці І. Пташнікава, як і ў прозе іншых пісьменнікаў гэтага пакалення, займае асаблівае месца, якое вызначаецца не толькі колькасцю і якасцю напісанага, асабіста перажытага і пераасэнсаванага пра ваенныя выпрабаванні, хоць і гэта, безумоўна, важны паказчык. Важнае значэнне мае той уплыў, які гады ваеннага ліхацення аказалі на станаўленне чалавечай асобы, фарміраванне высокамаральных якасцей, якія пазней праявіліся ў творчасці пісьменнікаў — дзяцей вайны. Памяць пра вайну, як зазначаў В. Бечык, — гэта «збалелая памяць», чалавечая, народная.

У канцы 1967 года ў часопісе «Полымя» была надрукавана аповесць І. Пташнікава «Тартак». У рэцэнзіях, артыкулах (В. Бечык, У. Гніламедаў і інш.) твор атрымаў высокую ацэнку. У прыватнасці, В. Бечык у артыкуле «Збалелая памяць», звяртаючыся да аповесці «Тартак», а таксама кнігі А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі…», піша: «Успаміны людзей, прыведзеныя ў дакументальна-публіцыстычнай кнізе, настолькі красамоўныя, што перад імі — у сілу іх фантастычнай жахлівай рэальнасці — здаецца, павінны адступіць уяўленне, зблякнуць любыя створаныя пісьменнікам мастацкія карціны таго часу і тых абставін.

І ўсё ж не. Вось кніга мастацкая, “вымышленая”, — аповесць І. Пташнікава “Тартак”, але яна не блякне побач з дакументальнымі сведчаннямі, яна як бы працягвае і дапаўняе іх, раскрываючы духоўны аб’ём і ўнутраную значнасць перажытага тады.

Са старонак гэтай аповесці таксама пахне палам і дымам, яна запоўнена стрэламі, выбухамі, заліта неўмяшчальна вялізным чалавечым горам» [1, с. 111].

**Асноўная частка.** Аповесць «Тартак» прысвечана трагедыі беларускіх «хатыняў». У аснову твора пакладзены рэальныя падзеі, лёс спаленай разам з людзьмі вёскі Дальва ў час блакады сорак чацвёртага года на возеры Палік. Гэта быў час, калі ў выніку паспяховага наступлення савецкіх войск і дзейнасці народных мсціўцаў пачалося вызваленне Беларусі.

Сюжэтныя падзеі твора звязаны з пакутлівым шляхам семярых чалавек, якія, каб выратаваць вёску, вязуць збожжа ў мясцовую камендатуру, а на самой справе непазбежна набліжаюцца да гібелі. Збожжа павінна быць здадзена заўтра да поўдня, інакш будзе спалена вёска — такую ўмову паставілі акупанты.

Вяскоўцы, спадзеючыся на ўратаванне, аддаючы апошняе, сабралі тры тоны зерня і адправілі везці яго ў камендатуру на сямі падводах Мірона Махорку, Уладзіміра Панка, дзеда Янука, Івана Боганчыка, Насту, Таню, Алёшу. Яны — галоўныя героі аповесці «Тартак». І. Пташнікаў свядома зрабіў героямі тых, хто непасрэдна не змагаўся і не мог змагацца з ворагам. Наста — жанчына-маці, Таня і Алёша — дзеці, Янук — глухі, Панок — хворы на кашаль [2, с. 505]. На наш погляд, выбіраючы героямі твора гэтых людзей, аўтар паказаў трагізм вайны ў самым адкрытым выяўленні, а таксама раскрыў усеагульны характар супраціўлення ворагу. Пісьменнік выбраў удалы сюжэтна-кампазіцыйны прыём і адметную наратыўную стратэгію: адна і тая ж падзея — паездка семярых герояў у Краснае — паказана ад пачатку да канца праз індывідуальнае ўспрыманне кожнага

з герояў. Для кожнага з іх гэта быў апошні, цяжкі і доўгі шлях. Чытач да канца аповесці не здагадваецца, што ўсе героі загінуць.

У ранейшых творах пісьменніка заўважалася, што І. Пташнікаў схільны даваць разгорнутыя і дакладныя апісанні герояў. Аднак у аповесці «Тартак» аўтар амаль не паказвае знешняга выгляду герояў, нічога не расказвае пра іх мінулае. Галоўным у паказе чалавека ў гэтым творы становіцца яго ўнутраны свет — думкі, пачуцці, перажыванні. Менавіта праз унутраны свет героя, вылучанага на першы план, аўтар ідзе да раскрыцця свету, жыццёвых абставін, паводзін, учынкаў чалавека. Пад канец твора ва ўяўленні рэцыпіента складваецца даволі акрэслены чалавечы характар, тып, які паступова набывае выразныя знешнія абрысы.

Важным структурным кампанентам гэтага твора з'яўляюцца ўнутраныя маналогі, успаміны, думкі герояў пра будучыню. Успаміны пра мінулае мірнае жыццё, дзе ўсё звыкла і прадказальна, даюць сілы жыць і прымушаюць герояў дзейнічаць.

Пісьменнік падрабязна прасочвае жыццёвыя лёсы кожнага з герояў, і ў гэтым заключаецца кампазіцыйна-наратыўная адметнасць твора. Падзеі, убачаныя вачыма сямі герояў, адлюстроўваюць страшную трагедыю не толькі гэтых людзей і спаленых карнікамі іх аднавяскоўцаў, але ўсяго беларускага народа.

Таня ў самым пачатку трагічнага шляху паранена выпадковай куляй. Усю дарогу яна знаходзіцца ў паўзабыцці. Кранальна падае пісьменнік вобраз дзяўчынкі-падлетка, якая толькі ўступіла ва ўзрост юнацтва. Дзяцінства засталося ў мінулым. Яе адносіны да таго, што адбываецца навокал, авеяны настроем юнацтва. Думкі гераіні звязаны з першым каханнем да юнака-суседа Юзюка, хвалюючы ўспамін пра хлопца ўвесь час жыве ў яе свядомасці. Юзюк — брат Алёшы, самага малодшага з возчыкаў, зусім яшчэ хлапчука. Гледзячы на Алёшу, Таня ўспамінае каханага: «Алёша, калі смяецца, — выліты Юзюк» [3, с. 39].

Пра Панка вядома, што ён пакінуў у вёсцы жонку з грудным дзіцём. Іншыя дзеці Панка таксама яшчэ малыя. Увесь час перад яго вачыма толькі яны. Нават у апошнія перадсмяротныя хвіліны ў свядомасці Панка ўзнікаюць аблічча яго жонкі Веркі і дзяцей: «Мігнулася ўваччу Верка з малым на руках: бегла з хаты, выносячы дзяцей у аселіцу, у альшэўнік да ракі. Над дваром, над самым асверам, махаў крыллем чорны, як збіты з дошак, самалёт з жоўтым крыжам ля хваста…

Панок быў пачуў яшчэ, як пасля запахла сухім пяском, пылам, — і падумаў, што конь цягне яго дарогай — дамоў, у вёску…» [3, с. 174].

Сярод возчыкаў пісьменнік вылучае вобраз Насты. Яна пакінула малых дзяцей адных дома, і таму яе сэрца «не на месцы». Думкі і перажыванні гераіні толькі пра дзяцей. Яе мацярынскую любоў, клопат і жаданне дапамагчы ў гэтай трагічнай дарозе ўвесь час адчуваюць Таня і Алёша — самыя малодшыя з сямі возчыкаў. У сваім мацярынскім клопаце, хваляванні пра лёс і жыццё дзяцей Наста да апошняй хвіліны застаецца па-жаночаму высакароднай. Апошнія думкі Насты — таксама пра дзяцей. Гераіня ўвасабляе сапраўдную мацярынскую самаахвярнасць: параненая, яна з апошніх сіл трымаецца і намагаецца ісці. Яе шлях — да дзяцей. «"Дзеці! Дзеці!.." — зноў закрычала яна. Яна ўжо мінула масток; ішла перастаўляючы ногі — ішла дамоў, — і чула, што не можа ісці: слабее… "Дзеці… Дзеці..." — клікнула яна, перавярнуўшыся на плечы. На яе пасыпаліся зверху зялёныя сасновыя іголкі» [3, с. 195].

Вобраз Насты набывае ў творы асаблівую маштабнасць і значнасць. Ён сімвалічны: жанчына-маці, ахвяруючы сабой, ратуе дзяцей — самае дарагое, што ў яе ёсць. Гэты жаночы вобраз у аповесці «Тартак» І. Пташнікава — увасабленне самаахвярнасці, мужнасці беларускай жанчыны, яе мацярынскага подзвігу. Вобраз Насты мае выключна важнае значэнне ў ідэйна-філасофскім напаўненні твора і, несумненна, з'яўляецца цэнтральным у сюжэтна-вобразнай сістэме.

Мірон Махорка шмат у чым падобны да Насты. Ён надзелены пачуццём грамадзянскай адказнасці за людзей, сваіх суседзяў і аднавяскоўцаў. У гэтым драматычным шляху возчыкаў

у нямецкую камендатуру герой спачатку думае пра іншых, а потым пра сябе. Яго вельмі хвалюе лёс вёскі. Праз успаміны Махоркі падкрэсліваецца маральнае аблічча гэтага героя. Ён дапамагае іншым, слабейшым, асабліва тым, хто ў бядзе. Перад гібеллю, непазбежнасць якой выразна ўсведамляе Мірон, ён думае пра дзяцей — Таню і Алёшу. Мужчына да апошняга імгнення шукае магчымасць іх ўратаваць. Алёша застаўся жыць толькі дзякуючы клопатам Махоркі. Несумненна, што гэты герой І. Пташнікава з'яўляецца носьбітам высакародных рыс беларускага нацыянальнага характару, увасабляе вобраз-тып мужчыны-абаронцы, бацькі, заступніка.

Яшчэ адзін герой твора — сталы вясковец нямы Янук. Жыццё яго абдзяліла радасцямі, і самыя светлыя ўспаміны Янука звязаны з нястомнай сялянскай працай і сям'ёй. Праз любоў і пяшчоту да ўнука Колечкі выразна раскрываецца маральнае харастcovo, душэўная чуласць героя. Ён згадвае, як хлопчык, які будзе яго працягам, робіць першыя крокі: «…Колечка пачаў, седзячы, зыбацца і махаць рукамі… на Колечку ніхто не глядзеў… Янук тады ўзяў выставіў Колечку пугаўё — тоўстае, пад'ялоўцавае, аблупленае ад кары… Колечка адразу стаў рачком, падняўся пасля на ногі, ззыбнуўся і… пайшоў да яго, Янука…» [3, с. 117]. У Януковай памяці часта ўзнікаюць успаміны пра з'яўленне партызанаў у родных мясцінах, пра яго дапамогу ў разгортванні партызанскага супраціўлення: «Партызаны ехалі праз Дальву ўвесь дзень ад раніцы, і ўсе чужыя. Янук ніводнага не пазнаў, не пазнаваў і ніхто ў вёсцы. Пасля ехалі і свае, кутузаўцы, тады зноў чужыя. Гэтыя, якіх ён вёз, мусіць, былі апошнія і ехалі здалёку…» [3, с. 123]. Пастаянныя ўспаміны гэтага героя пра партызанаў дапамагаюць узнавіць рэальныя, трывожныя і трагічныя абставіны жыцця ў партызанскай зоне: «Янук глядзеў, як натапырыліся ззаду на санях партызаны і паўставалі на ногі. Яму здалося, што ён пачуў, як уперадзе пачалі страляць: бух-бух…» [3, с. 123].

Алёша — малодшы з сямі герояў аповесці, пра якога аўтар заўважае: «Дзіця яшчэ зусім, дзясяты год яму…» [3, с. 22]. У час гэтай драматычнай паездкі хлопчык трымаецца непасрэдна, натуральна, яго яшчэ не кранула трывога дарослых. У паводзінах героя не адчуваецца напружанасць і трывога, якой ахоплены дарослыя возчыкі. Успаміны Алёшы пра сям'ю і мірныя дні напоўнены дзіцячай цеплынёй і непасрэднасцю.

У трагічным фінале аповесці «Тартак» І. Пташнікава ўсе возчыкі загінулі, толькі Алёша застаўся жывы. Уратавацца яму дапамог Мірон Махорка. Хлопчык уцёк і прыйшоў у родную вёску, але карнікі спалілі Дальву і людзей. З жахам ён глядзеў на тое, што засталося ад вёскі: «У яго затрасліся ногі… Ён пазнаў яшчэ, што стаіць ля Боганчыкавага плота на дзядзінцы. Плот абгарэў — быў ля самага хлева — пачарнела жэрдзе. Агонь гнала з двара па зямлі, і ля плота выкаціла сухую, прыбітую нагамі траву. Вецер сагнаў з яе чорны попел, і ля самай зямлі з пяску было відаць белае карэнне…» [3, с. 205].

Толькі Іван Боганчык, адзін з сямі герояў твора, выклікае супярэчлівыя, нават адмоўныя адносіны ў чытачоў. Выпрабавальным момантам для герояў твора стаў загад карнікаў паставіць падводы з людзьмі наперадзе свайго атрада, каб уратавацца ад партызанскіх куль у час смяротнай небяспекі.

Праз успаміны Івана Боганчыка аўтар расказвае пра тое, як герой уцякаў з акопаў. Зараз ён усе сілы прыкладае толькі для выратавання свайго жыцця. Мірон Махорка і Наста спрабуюць выратаваць дзяцей. Боганчык жа ратуецца сам, як і ў пачатку вайны, калі ўцёк з фронту дахаты. У характары і паводзінах Боганчыка няма літасці да іншых і адказнасці за жыццё тых людзей, якія знаходзяцца побач. Страх за ўласнае жыццё ператварае яго ў эгаістычнага баязліўца.

Сем герояў аповесці «Тартак» прадстаўлены пісьменнікам адметна, як сем чалавечых характараў, вобразаў-тыпаў і лёсаў. Агульная трагедыя беларускага народа, як паказвае аўтар, складаецца з трагедый індывідуальных. Трагізм вайны — у гібелі бязвінных людзей. Мастацкімі сродкамі аўтар даводзіць, што за смерцю кожнага чалавека стаіць знікненне адзінай у сваёй непаўторнасці асобы. Сваіх герояў І. Пташнікаў прадставіў пераканаўчымі характарамі-тыпамі, важнымі па сваёй мастацкай канцэптуальнасці, але рознымі па духоўнай

і маральна-этычнай сутнасці. Чалавечыя характары ў творы разгорнуты сцісла, нешматслоўна, але з належнай мастацкай глыбінёй і дакладнасцю.

Трагізм вайны ў аповесці «Тартак» І. Пташнікава паказаны не праз колькасць забітых людзей, знішчаных вёсак, а праз псіхалагічна дакладнае мастацкае ўзнаўленне душэўных пакут герояў, што адчуваюць надыход немінучай, жахлівай заўчаснай гібелі ў полымі вайны.

Эмацыянальнай асновай аповесці сталі дзіцячыя ўспаміны пісьменніка, лёс якога абпаліла вайна. І. Пташнікаў многа пережыў у блакаду, а вёска Дальва знаходзілася ў яго родных мясцінах. Вайна для пісьменніка і яго герояў — гэта страшнае парушэнне свету, у якім людзі вымушаны выжываць. Ахопленыя страхам, героі твора інстынктыўна вяртаюцца думкамі да мірнага жыцця, згадваючы яго да драбніц, нібы перажываючы ўсё нанова. Ва ўспамінах кожны герой І. Пташнікава пераносіцца ў хоць і цяжкае, але мірнае мінулае, якое адлюстроўвае непаўторна-асабісты свет чалавека. Індывідуальнасць лёсаў, непадобнасць асабістага свету герояў мае для пісьменніка прынцыпова важнае значэнне. Нават аб’яднаныя агульнасцю апошняга шляху, кожны з герояў існуе самастойна як адзіна магчымы і непаўторны свет. Сучаснае для іх — працяг мінулага і заканчэнне яго. Праз успаміны перажываюцца найбольш запамінальныя і важныя моманты жыцця, асэнсоўваецца яго каштоўнасць. Прыём рэтраспекцыі дапамагае пісьменніку сцвердзіць ідэю непаўторнасці лёсу і жыцця чалавека.

І. Пташнікаў таленавіта разгортвае метафарычнае параўнанне вайны з тартаком, лесапільняй, дзе пілы рэжуць жывое дрэва, здрабняючы яго на дошкі, трэску. Вайна — гэта тартак, які знішчае свет і прыводзіць да гібелі бязвінных мірных людзей. Перажываннем трагедыі прасякнута мастацка-псіхалагічная атмасфера твора. Усе элементы паэтыкі аповесці падпарадкаваны адной мэце: паказаць драматычную гісторыю народа праз лёс асобных людзей. Трагедыя вайны, спаленыя вёскі — гэта трагедыя не абстрактная, а народная і агульначалавечая. У гібелі бязвінных Тані, Насты, Махоркі выяўлена знікненне адзінага ў сваёй непаўторнасці і незваротнасці індывідуальнага свету асобы. І. Пташнікаў выдатна паказвае чалавечую ўнікальнасць кожнага героя і дае гэта адчуць чытачу, стварае магчымасць зразумець, *што* ў кожным з іх памірае і *што* ў выніку страчваецца.

Важнае значэнне ў кампазіцыйна-апавядальнай сістэме І. Пташнікава маюць малюнкі прыроды, якія падпарадкаваны эмацыянальна-сэнсаваму напаўненню аповесці. Пейзажы ўзмацняюць адчуванне глыбіннай сувязі прыроды і чалавека, перадаюць аўтарскую ідэю незнішчальнасці жыцця. Яны эмацыйна абвастраюць прадчуванне небяспекі, трывогі і трагедыі. Каляронімы, пахі і гукаапісанні ў аповесці таксама падпарадкаваны стварэнню менавіта такой псіхалагічнай атмасферы. Трагедыю вайны, кроў і пакуты яе герояў адчуваюць, здаецца, неба, зямля, месяц і сонца. «Нічога не было чуваць. Выплыў з-за лесу месяц і вісеў цяпер ля цёмнай, што конь з нагамі і галавой, хмары. Павіднела. У тумане было відаць, як на моху ля ног ляжаць леташнія белыя сасновыя шышкі. Пасля далёка ў прагале, на балоце, мусіць, закрычала патрывожаная кнігаўка. Кнігавак, відаць, было многа, бо адна не спраўлялася б так часта крычаць. Турчалі жабы, моцна, на ўвесь лес — аж ішлі адгалоскі…» [3, с. 92].

І. Пташнікаў, апісваючы падзеі, якія адбываліся на працягу аднаго дня, некалькі разоў згадвае сонца. Яно трывожна-чырвонае і часта хаваецца ў хмары. Героі бачаць зарыва пажараў, адчуваюць смурод гарэлага, які заглушае жывыя пахі лесу.

Вобраз-матыў магутнай і велічнай прыроды надае твору філасофска-жыццесцвярджальны падтэкст. Зруйнаваная вайной зямля і прырода выстаяць, адновяцца, як адродзіцца загубленае жыццё на былых папялішчах. Прырода ва ўсім багацці яе праяўленняў з’яўляецца той глебай, на якой заўсёды «вырастаюць» чалавек і народ. У прыродзе знаходзяцца магутныя і невычэрпныя сілы адраджэння жыцця.

**Заключэнне.** Аналітычнае даследаванне тыпалогіі герояў, апавядальнай манеры, кампазіцыйнай адметнасці аповесці І. Пташнікава «Тартак» дазваляе зрабіць наступныя вывады: лёс герояў у агульнай апавядальнай плыні аповесці — гэта галасы людзей, якія расказваюць

сучаснікам пра свае апошнія дні, пра няпростае і трагічнае жыццё ў час вайны. Гэтыя галасы, як і маналогі герояў сусветна вядомай кнігі «Я з вогненнай вёскі…» (А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік), звернуты да людзей XXI стагоддзя і папярэджваюць пра небяспеку вайны.

У аповесці «Тартак» пісьменнік не толькі па-мастацку асэнсаваў трагізм вайны, але і выявіў вялікую народную сілу — супраціўленне беларускага народа фашызму. Паказаць трагізм людскіх лёсаў у час вайны аўтар змог дзякуючы абраным сюжэтным падзеям, тыпалогіі герояў, выключнай увазе да вобразных падрабязнасцей і псіхалагічна пераканаўчых заглыбленняў ва ўнутраны свет чалавека.

У творы выразна раскрываецца канцэпцыя гераічнага, праяўленне якога пісьменнік бачыць у надзвычайнай жыццёвай трываласці і маральнасці, дзякуючы якім героі пераадольваюць выпрабаванні.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Бечык, В.* Свет жывы і блізкі : літаратур.-крыт. арт. / В. Бечык. — Мінск : Маст. літ., 1974. — 205 с.

2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т імя Я. Купалы ; Навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. — Мінск : Бел. навука, 2002. — Т. 4, кн. 1 : 1966—1985. — 928 с.

3. *Пташнікаў, І.* Збор твораў : у 4 т. / І. Пташнікаў. — Мінск : Маст. літ., 1990. — Т. 2. — 480 с.

Паступіў у рэдакцыю 24.12.2019